**13 верасня** ў галерэі «Атрыум» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрыўся выставачны праект **«Нацыянальная бібліятэка Беларусі: учора, сёння, заўтра»**, прымеркаваны да 100-годдзя ўстановы. На экспазіцыі прадстаўлены архіўныя і сучасныя мастацкія фатаграфіі, сабраныя спецыяльна да стогадовага юбілею бібліятэкі. Архіўныя фатаграфіі будынка бібліятэкі ў Юбілейным доме на Захар'еўскай вуліцы (сёння праспект Незалежнасці), характэрнае рэтрафота каманды першых супрацоўнікаў бібліятэкі з легендарным дырэктарам Іосіфам Сіманоўскім, зробленае ў 1926 г. у дворыку бібліятэкі, архітэктурны шэдэўр свайго часу – будынак бібліятэкі на Чырвонармейскай, адкрыты да яе дзесяцігадовага юбілею ў 1932 г., паказваюць мінулае стагоддзе бібліятэкі. Фотаздымкі сучаснай бібліятэкі адлюстроўваюць шматграннасць яе амплуа, каштоўнасць і святло ведаў, бясконцасць пазнавальнага свету. Большасць з фотаздымкаў экспануюцца ўпершыню.

Выставачны праект будзе працаваць да 1 кастрычніка.